# Уладзіміру Караткевічу з зямлі пад белымі крыламі – 90 гадоў




Фота з сайта nlb.by

Чытайце на стар. 2

# Кнігі з кабінета Караткевіча

***24 лістапада ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі пачала працу выстава «З кніг Уладзіміра Караткевіча», прымеркаваная да 90-годдзя з дня нараджэння класіка.***

Упершыню можна пабачыць кнігі з кабінета пісьменніка і яго бібліятэкі, даведацца, якія рукапісы, старадрукаваныя і рэдкія выданні захоўваліся ў кнігазборы творцы.

Асноўнае месца ў экспазіцыі нададзенае экслібрысам У. Караткевіча. Пераважная іх частка зробленая самім пісьменнікам: разнастайныя кніжныя знакі, што адмыслова выкананыя і падабраныя для пэўных выданняў. На выявах – знакавыя постаці беларускай культуры: Скарына, Гусоўскі, а таксама любімыя Караткевічам ветразі. Вылучаецца экслібрыс з абрысамі зброі касінераў. Яго пячатку і клішэ можна ўбачыць на выставе.

Несумненную цікавасць абудзяць экслібрысы, створаныя для пісьменніка мастакамі. Працы Арлена Кашкурэвіча, Міколы Купавы, Уладзіміра Басалыгі, Іосіфа Капеляна, Генадзя Грака і Вячкі Целеша можна ўбачыць на старонках выданняў і даведацца гісторыю іх стварэння.

Унікальныя дароўныя надпісы на кнігах уводзяць у сяброўскае і творчае кола пісьменніка. У экспазіцыі – аўтографы родных Уладзіміра Сямёнавіча, таварышаў і настаўнікаў маладосці, літаратурных прататыпаў, вядомых творцаў, сяброў і паплечнікаў – Адама Мальдзіса, Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Янкі Брыля ды іншых, а таксама нечаканы па-караткевічаўску жартаўлівы аўтограф самому сабе.

Выстава падрыхтаваная сумесна з захавальнікамі спадчыны У. Караткевіча – сям'ёй пляменніцы пісьменніка Алены Іванаўны Сінькевіч. У экспазіцыі таксама прадстаўленыя кнігі з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

Выставу «З кніг Уладзіміра Караткевіча» можна пабачыць па 17 студзеня 2021 г.

***Паводле інфармацыі арганізатараў***



Фота з сайта nlb.by